**Собалева, Л.** Соф’я Гальшанская (Друцкая) – вядомая гістарычная постаць / Л. Собалева // Древнему Друцку 1000 лет : материалы к научно-практической конференции / сост. И. А. Шишкова ; науч. ред. О. Н. Левко. – Витебск, 2001. – С. 51–54.

## СОФ’Я ГАЛЬШАНСКАЯ (ДРУЦКАЯ) – ВЯДОМАЯ ГІСТАРЫЧНАЯ ПОСТАЦЬ



З Друцкай зямлёй звязаў лёс Соф’ю Гальшанскую (Друцкую) (1405– 21 верасня 1461 года), ліцьвінскую князёўну, польскую каралеву, заснавальніцу дынастыі Ягелонаў. Гісторыкі да яе ставяцца неадназначна: адны яе ўхваляюць, другія, як, напрыклад, Я. Длугаш – крытыкуюць, адносяцца непрыязна. Бясспрэчна адно: гэта жанчына ўвайшла ў гісторыю, заняла ў ёй сваю нішу дзякуючы сваёй жаноцкасці, сваёй верацярпімасці. Яна магла злучаць розныя погляды, урэшце рэшт, яна – маці сваіх знакамітых сыноў, у якіх яна таксама выхавала любоў да Айчыны, павагу да «каранёў». Гістарычныя факты таму пацвярджэнне.

Старажытны княжацкі род Гальшанскіх, прадстаўнікі якога займалі высокія дзяржаўныя пасады ў Вялікім княстве Літоўскім, меў родавы маёнтак у Гальшанах (недалёка ад Ашмянаў). Напрыканцы XIV ст. ён належаў Івану Альгімунтавічу, намесніку кіеўскаму, жонка якога, Агрыпіна, была сястрою Ганны Смаленскай, жонкі Вітаўта. Пасля яго смерці маёнтак перайшоў да старэйшага сына Андрэя, які хварэў і заўчасна памёр, пакінуўшы трох дачок: Васілісу, Соф’ю і Марыю. Дочкі жылі разам з маці, Аляксандрай Дзмітрыеўнай Друцкай, у яе роднага брата Сямёна Друцкага. На жаль, амаль нічога не вядома пра дзяцінства Соф’і ў Друцку, акрамя таго, што выхоўвалася яна разам з шасцю стрыечнымі братамі. Верагодна, сярод сваіх блізкіх любімых людзей і маляўнічых мясцін Друччыны яно было шчаслівым і радасным. Тым больш і шэраг даследчыкаў сцвярджаюць, што польская каралева больш прыхільна ставілася да матчынай радні. Той факт, што менавіта дзядзька Сямён Дзмітрыевіч даў дазвол на шлюб сваёй пляменніцы Соф’і з польскім каралём Ягайлам, сведчанне таму.

Да шлюбу Ягайлы з Соф’яй стаўленне неадназначнае. Магчыма, і не абыйшлося без інтрыгі. Але як можна было не захапіцца, прайсці міма сапраўднай прыгажосці. Паводле Я. Длугаша, вызначалася князёўна «прыгажосцю болей, чым цнотамі». «Было ў мяне тры жонкі, дзве ляхавіцы, а трэцяя немка, але плоду з імі не меў, а цяпер прашу цябе, сасватай мне ў князя Сямёна пляменніцу меншую Соф’ю, каб я за сябе яе замуж узяў, можа хоць з роду рускага мне Бог дзяцей дасць, – так і занатаваў летапісец у «Хроніцы Быхаўца» зварот Ягайлы да Вітаўта. Па старадаўнім беларускім звычаі нельга было выдаваць малодшую сястру замуж раней за старэйшую, таму Васілісу хутка сасваталі князю Івану Бельскаму, а Соф’ю заручылі з каралём Ягайлам.

Шлюб Ягайлы з Соф’яй адбыўся ў Наваградку 24 сакавіка 1422 года. У фарным касцёле, фундатарам якога быў Вітаўт, адбылося вянчанне. Ліцьвінская князёўна, нашчадак полацкіх князёў Соф’я Гальшанская (Друцкая) стала польскай каралевай. Вяселле было шумным, але ці ашчаслівіла яно абодвух? На момант жаніцьбы Ягайлу быў 71 год, а яго чацвёртай жонцы – толькі 17... Ягайла раіўся з Вітаўтам, што зрабіць, каб пазбавіць Соф’ю лёгкадумнасці і нічога лепшага

два венцаносцы не прыдумалі, як даваць каралеве менш есці. А яе «старылі» бясконцыя інтрыгі, спробы праз яе ўплываць на мужа, нежаданне ўплывовых бакоў у яе каранацыі.

Трэба аддаць належнае: пры ўсей складанасці Соф'я хутка ацаніла сітуацыю, свядома звязала сябе з адной з груповак, каб далей карыстацца яе падтрымкай. Рашэнне было занадта смелым, бо ставіла яе супраць тых, хто выдвінуў яе наверх, у тым ліку і Вітаўта, сваяка і апекуна, адносіны з якім увесь час былі няпростымі.

Асабістай перамогай Соф'і стала каранацыя 12 лютага 1424 года ў Кракаве. Святочныя мерапрыемствы працягваліся тыдзень. Ніколі за ўсю гісторыю Польшчы не было такой урачыстай каранацыі каралеўскай жонкі. «Нядаўняя беларуская дзяўчына», як падкрэсліваў Я. Длугаш, больш упэўнена стала адчуваць сябе у новай айчыне, не забываючыся, аднак, пра родныя мясціны. Заўсёды яна падтрымлівала добрыя адносіны з блізкімі, да апошніх дзён жыцця вакол яе знаходзілася пэўная колькасць праваслаўнай шляхты, і нават у сталым узросце загадала, каб пахавалі яе паводле звычаяў, на якіх яна выхоўвалася ў дзяцінстве.

31 лістапада 1424 года каралева Соф'я нарадзіла Ягайлу сына Уладзіслава. Пазіцыі каралевы ўзмацніліся. У пісьме папе Марціну V Ягайла назваў сына «дзедзічам на цэлым абшары». З'явіўся законны спадкаемца вялікакняскай кароны, у Польшчы становішча каралевіча заставалася нявысветленым. Соф'я распачала барацьбу за прызнанне сына спадкаемцам кароны і ў Польшчы, а таксама за прызначэнне сябе рэгенткай на выпадак, калі б Ягайла памёр да паўналецця сына (14 гадоў – аўт.). Карэктывы ў жыццё ўнеслі наступныя драматычныя падзеі...

10 траўня 1426 года Соф'я нарадзіла другога сына – Казіміра, які пражыў мала і быў пахаваны ў каралеўскай катэдры. 30 лістапада 1427 года з'явіўся на свет трэці сын, якога ахрысцілі Казімірам Андрэем (другое імя ў гонар дзеда, князя Андрэя Гальшанскага). За некалькі месяцаў да яго нараджэння сярод каралеўскіх набліжаных распаўсюдзіліся чуткі, быццам дзіця народжана Соф'яй не ад мужа: «Каралева польская Софія з некаторымі рыцарамі польскімі патаемна мела залёты». Зразумела, для каго гэтыя чуткі прадвызначаліся. Ягайла паверыў, і пачалося доўгае дазнанне. За Соф'яй пачалі сачыць, бо, як занатаваў Длугаш, баяліся «каб пры звычных плоці сваей недахопах не трапіла ў горшую бяду». Рэха скандалу пракацілася цераз межы Польшчы і ВКЛ. Год шукалі доказаў Соф'інай нявернасці. Сойм у Гародне паставіў кропку ў гэтым скандале. Соф'я прынесла клятву ў сваей невіноўнасці, прыйшло жаданае прымірэнне. Але яно не падняла аўтарытэт каралевы, дынастыі, не вярнула цёплых сяброўскіх адносін паміж мужам і жонкай. Адзінае, што аб'ядноўвала іх – барацьба за карону для старэйшага сына. Жыццё зрабіла іх палітычнымі саюзнікамі.

У маі 1434 г. 80-гадовы Ягайла захварэў і хутка яго не стала. Апошнія яго просьбы былі аб абранні каралём старэйшага сына і даручэнні апекі над каралевічамі Зб. Алясніцкаму. Няма сведчанняў, каб ён згадваў Соф'ю... Магчыма, плёткі аб здрадзе запаланілі старога Ягайлу, тым больш вядома, што публічныя абвінавачванні кароль дазваляў сабе і да двух першых жонак, хоць розніца ва ўзросце паміж імі і Ягайлам была нязначнай. На дзень смерці Ягайлы Соф'і споўнілася 29 гадоў, яе сынам – 10 і 7. Краіна засталася без караля, і Соф'я ўсе зрабіла дзеля абрання свайго сына манархам: ішла на ўступкі, замірэнне са сваімі былымі праціўнікамі. 18 чэрвеня 1434 года польскім каралём быў абраны Уладзіслаў Ягайлавіч. Апошні раз Соф'я яго ўбачыць у 1439 г. перад ад'ездам у Венгрыю, пасля жаніцьбы на аўдавелай каралеве Эльжбеце. Перамогі над туркамі

прынеслі Уладзіславу славу ва ўсёй Еўропе, Соф'я жыла гэтымі весткамі і гордасцю за сына, які стаў узорам каталіцкага рыцара.

У 40-я гг. яна не займалася палітычнай дзейнасцю, пакутавала ад развітання з сынамі. Малодшы, 13-гадовы Казімір, быў абраны 29 чэрвеня 1440 года на вялікакняскі трон у Вільні і перастаў быць толькі намеснікам брата. Магчыма, не абыйшлося і тут без Соф'і, якая і для малодшага сына жадала кароны. Пасля смерці Уладзіслава пад Варнай у 1444 г. Соф'я зноў вярнулася да палітычнага жыцця, каб пільнаваць інтарэсы малодшага сына.

25 чэрвеня 1447 года ў Кракаве Казімір каранаваўся. Сярод гасцей былі дзядзькі па маці – Васіль Красны Друцкі і Юрый Сямёнавіч Гальшанскі. Становішча маці-каралевы Соф'і з часу каранавання Казіміра значна палепшылася. Яна была для Казіміра дарадцам, у сваей знешняй палітыцы Казімір абапіраўся на даўніх прыхільнікаў маці.

Соф'я дачакалася чатырох унукаў і адной унучкі (усяго ў Казіміра было шэсць сыноў і сем дачок). Чацвёртага па яе жаданні назвалі Аляксандрам – хрысціянскім імем вялікага князя Вітаўта.

Памерла Соф'я 21 верасня 1461 года ва ўзросце 56 гадоў. Пахавалі каралеву ў Вавельскім кафедральным касцёле ў капліцы св.Тройцы. Цела яе, па завяшчанні Соф'і, паклалі каля заходняй сцяны, па беларускіх звычаях, бо ў праваслаўных гэты бок свету сімвалізуе вечнасць...

***Л. Собалева***